Дзяніс Дук

РЭЧАВЫ КОМПЛЕКС З РАСКОПАК НА ЗАПАЛОЦКІМ ПАСАДЗЕ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА Ў 2004 І 2006 ГАДАХ

У 2004 г. археалагічным атрадам Полацкага дзяржаўнага універсітэта была адкрыта заходняя частка Запалоцкага пасада старажытнага Полацка на плошчы 21 га. Усяго было закладзена 8 шурфоў і раскоп 1 (140 кв.м), агульная раскапаная плошча склала 154 кв.м (Дук, 2007, с. 33–36). Раскоп 2 (168 кв.м) даследаваны ў 2006 г. у працяг раскопа 1. Такім чынам, сумарна ўскрытая ў 2004 і 2006 гг. плошча склала 322 кв.м (мал. 1).

У артыкуле прапанавана вызначэнне храналогіі артэфактаў з раскопаў 1, 2 і васьмі шурфоў у Запалоцці. Прадстаўлены комплекс рэчаў унікальны для сярэдневяковага горада, паколькі паходзіць са стратыграфічнага пласта, які аднародны па структуры, не пашкоджаны прамысловай дзейнасцю і не мае слядоў перакопаў. Выключэнне складае толькі культурны пласт шурфа 4, які мае магутнасць больш за 3 м і пераадкладзены па структуры (Дук, 2006, с. 52–53). Знаходкі з гэтага шурфа пазначаюцца асобна.

Культурны пласт раскопаў 1, 2 і шурфоў мае магутнасць 0,8–1,6 м. Выразна вылучаюцца тры стратыграфічныя гарызонты, з якіх найбольшую колькасць знаходак утрымлівае сярэдні стратыграфічны гарызонт.

Верхні стратыграфічны гарызонт – гэта вельмі бедны на знаходкі пласт зярністага, аднароднага супеску жоўтага ці светла-карычневага колеру з невялічкімі каменьчыкамі круглай ці авальнай формы, а таксама з кавалачкамі чырвонай гліны. Размешчаны на большай частцы раскопа адразу пад дзірваном. Сярэдняя магутнасць пласта 0,3 м.

У верхнім стратыграфічным пласце разам з керамікай XI–XII стст. знойдзены фрагменты гаршкоў і місаў XVII–XIX стст. Гаршкі XVII ст. зроблены на нажным ганчарным крузе і вылучаюцца добрай якасцю апрацоўкі паверхні (мал. 6:11–12). Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены накладнымі тронкамі з жалезнымі клёпкамі на састаўную рукаяць нажа (мал. 12:6), металічнай шпорай (мал. 6:10), кавалкам бронзавага дроту (мал. 3:10). Шпора належыць да групы IV па класіфікацыі Ю.М. Бохана. Гэты тып шпор быў сфармаваны ў XV ст. і бытаваў на працягу першай паловы XVI ст. (Бохан, 2002, с. 226). Важнай знаходкай з'яўляецца білонавая манета герцагства Прусія – драйпёлькер Георга Вільгельма (1619–1640 гг.), эмісія 1619 г. Манета мае адтуліну для нашэння на вяровачцы, і, верагодна, магла знаходзіцца ў складзе караляў.

Асноўная частка рэчаў знойдзена ў невялікім па магутнасці, стратыграфічна аднародным пласце зямлі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта і непасрэдна на мацерыку. Сярэдні стратыграфічны гарызонт распаўсюджаны на ўсёй плошчы раскопаў і мае мінімальную магутнасць 0,18–0,2 м, максімальную – да 0,6 м, у сярэднім – 0,3–0,4 м. Пласт камкаваты, суглінкавы і дастаткова аднародны па структуры, мае цёмна-шэры з карычневатым адценнем колер. У пласце даследаваны рэшткі вогнішчаў і развалы печаў-каменак.

Ніжні стратыграфічны гарызонт – гэта перадмацерыковы, суглінкавы, светлы з жаўтаватым адценнем ці бліжэй да карычневага пласт з шэрымі плямкамі і кавалачкамі вуголля. Структура пласта мае адрозненні: у паўднёвай і ўсходняй частцы раскопа 1–2 пласт зярністы, прадстаўлены жвірам з нешматлікімі дамешкамі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

арганікі, на большай частцы раскопа – ён карычневатага колеру, камкаваты, суглінкавы з рудымі плямамі пяску са жвірам. У гэтым пласце былі зафіксаваны сляды драўляных абарончых умацаванняў. Магутнасць пласта ад 0,15 да 0,3 м.

Ніжні стратыграфічны пласт бедны на знаходкі. Сярод іх фрагменты гаршкоў (мал. 16), па форме аналагічныя большасці гаршкоў з мацерыковых ям. Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены крэсівам (мал. 9:3), рыбалоўным кручком (мал. 9:6), рамбічным наканечнікам стралы (мал. 7:7), прабойнікам (мал. 8:4), жалезнай скабой (мал. 8:7), жалезнай абоймай з клёпкамі (мал. 2:13) і жалезнай створкай невядомага прызначэння (мал. 10:2).

Храналогія знаходак дазваляе больш дакладна вызначыць час засялення і працягласць існавання заходняй часткі пасада. Паколькі керамічны матэрыял і індывідуальныя знаходкі з сярэдняга і ніжняга стратыграфічнага гарызонта ўтвараюць адну храналагічную групу, іх правамоцна разгледзець разам.

На малюнку 2 прадстаўлена калекцыя рэчаў, якія могуць сведчыць пра пачатак засялення заходняй часткі пасада. Калекцыя найбольш ранніх артэфактаў налічвае каля 20 металічных і шкляных вырабаў. Усе рэчы знойдзены ў сярэднім стратыграфічным гарызонце, за выключэннем шпількі (мал. 2:12) і жалезнай абоймы з клёпкамі (мал. 2:13), якія знойдзены ў мацерыковых ямах.

Так, два жалезных калачападобных крэсіва з язычком (мал. 2:1; 9:3) маюць аналагі з крэсівамі з курганных пахаванняў X–XI стст., а таксама знойдзенымі ў культурных напластаваннях гарадоў Беларусі другой паловы XI–XII стст. (Загорульский, 1982, с. 248; Заяц, 1995, с. 60; Макушников, 2006, с. 132). Адно з крэсіваў (мал. 9:3) знойдзена ў ніжнім стратыграфічным гарызонце.

Ключ да навяснога замка тыпу А (мал. 2:3) паводле наўгародскай класіфікацыі Б.А. Колчына датуецца X – сярэдзінай XIII ст. (Колчин, 1982, рис. 3).

Жалезная шпілька з кольцам і шарападобнай галоўкай (мал. 2:12) знойдзена ў мацерыковай яме. Яна мае даўжыню 12 см, дыяметр галоўкі 4,5 см. Такія шпількі выкарыстоўваліся ў Ноўгарадзе з X ст. да сярэдзіны XII ст. (Покровская, 1998, с. 176; Седова, 1981, с. 77). Паводле тыпалогіі Л.А. Голубевай, гэтая шпілька належыць да II групы. Такія вырабы знойдзены ў пахаваннях смаленскіх крывічоў канца XI–XII ст. Верагодна, яны выкарыстоўваліся для зашпільвання верхняга адзення (плашча) і размяшчаліся звычайна на правым плечуку (Голубева, 1971, с. 121).

Палова літога бронзавага бранзалета з зааморфнымі канцамі ў выглядзе стылізаваных змяіных галоваў (мал. 2:10). Такія бранзалеты шырока вядомы ў балцкіх старажытнасцях X–XIII стст. (Штыхаў, 2000, с. 26; Вайцяховіч, 2005, с. 156; Семянчук, 2002, с. 192). Аналагічны бранзалет раней быў знойдзены і ў Полацку (Тарасаў, 1998, с. 150).

Дзежкападобная пацерка празрыстага светла-жоўтага колеру (мал. 2:2), якая знойдзена ў мацерыковай яме, мае дыяметр 0,7 см. Дзежкападобныя пацеркі ў раннесярэднявечных гарадах датуюцца XI–XIII стст. (Бубенько, 2004, с. 93). У Полацку іх максімум прыходзіцца на XI – пачатак XII ст. (Тарасаў, 1998, с. 33).

Глінянае праселка мае дыяметр каля 2,8 см, дыяметр адтуліны – каля 1 см (мал. 2:4). Аснова праселка плоская, верхняя частка з кілевідным выступам. Гліняныя праселкі ў гарадах Беларусі бытавалі да сярэдзіны XI ст., пасля чаго іх выцясняюць імпартаваныя оўруцкія шыферныя праселкі (Звяруга, 2000, с. 422).

Кілепадобны жалезны наканечнік стралы з пашырэннем у ніжняй палове даўжыні пяра (мал. 2:5) не мае прамых аналагаў. Гэты наканечнік выдатна захаваўся. Яго вышыня 8,4 см, шырыня пяра 1,4 см, даўжыня чаранка 3,4 см. Наканечнік стралы мае далікатна апрацаваную паверхню, шасцігранны ў сячэнні чаранок. Наканечнікі стрэл падобнага тыпу характэрны для X–XI стст. (Медведев, 1966, табл. 13:30, с. 63).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Круглы свінцовы выраб з прадрапанай выявай знака ў выглядзе літар «IX» мае вонкавы дыяметр 2,4 см, дыяметр адтуліны 0,7 см (мал. 2:9). Другі выраб не ўтрымлівае выяў, мае дыяметр 1,8 см, адтуліна 0,5 см (мал. 3:7). Падобныя вырабы знойдзены ў культурных напластаваннях Ноўгарада з X па XIV ст. (Седова, 1981, с. 157–158) і маглі выкарыстоўвацца як гузікі для грубага верхняга футранога адзення.

Бронзавая сякерка-падвеска мае вышыню 4,5 см, верхняя частка (вушка) – абламана, шырыня ляза сякеркі складае 3,3 см (мал. 2:7). Такія сякеркі выкарыстоўваліся як прывескі і знойдзены ў Ноўгарадзе ў пластах X–XII стст. (Колчин, 1982, с. 164). Гэтыя сякеркі паўтаралі форму шырокалязовых сякер, арэал іх выкарыстання быў шырокі і ахопліваў практычна ўвесь усходнееўрапейскі рэгіён (Даркевич, 1961, с. 92–94).

Фрагмент падковападобнай фібулы (мал. 2:8) аналагічны фібуле, знойдзенай у Полацку на Ніжнім замку ў пласце X–XI стст. (Тарасаў, 1998, мал. 48).

Адзначым знаходку жалезнай абоймы (?) з клёпкамі, знойдзенай у мацерыковай яме № 10 (мал. 2:13). Прызначэнне вырабу не высветлена.

Да калекцыі найбольш старажытных рэчаў, відаць, трэба аднесці унікальны артэфакт – замочак мініяцюрных памераў (вышыня 3,5 см), які зроблены з жалеза і медзі (мал. 2:11). Замочак не з'яўляўся функцыянальнай рэччу, паколькі адтуліна пад ключ у ім адсутнічае, пласціны корпуса і дужка трывала спаяны медзю, а сам замок мае форму лунніцы. Аналагаў вырабу намі не знойдзена.

Да калекцыі ранніх вырабаў можна аднесці таксама два нажа, спінка якіх мае ўступ пры пераходзе да чаранка, а лязо знаходзіцца з чаранком у адной плоскасці (мал. 5:11, 14). Адзін нож мае даўжыню 10 см (мал. 5:14), другі нож захаваўся фрагментарна (адламаны кавалак чаранка (мал. 5:11)). Такія нажы знойдзены на тэрыторыі Беларускага Панямоння (курганны могільнік XI–XII стст. каля вёскі Корастава (Гуревич, 1962, рис. 96:3)). У Віцебску яны знойдзены разам з ляпной керамікай у мацерыковых ямах і на мацерыку, датуюцца другой паловай IX–X стст. (Бубенько, 2004, с. 65). Чаранкі такіх нажэй, як правіла, трохвугольныя ў сячэнні, хаця сустракаюцца нажы і з прамавугольным у сячэнні чаранком.

Такім чынам, пазначаны комплекс рэчаў сведчыць пра засяленне даследаванай часткі Запалоцкага пасада ў XI ст., аднак не выключае магчымасць пачатку асваення гэтай тэрыторыі на мяжы X–XI стст. Асноўная колькасць вырабаў мае шырокі храналагічны дыяпазон бытавання (XI–XIII стст.). Ювелірныя вырабы складаюць асобную групу сярод усёй колькасці індывідуальных знаходак. Срэбны пярсцёнак зроблены з сямі пераплеценых драцін, сабраных на разамкнутых канцах у адзін гладкі дрот (мал. 3:2). Бронзавыя і срэбныя аналагі гэтага пярсцёнка знойдзены ў курганных пахаваннях XI–XII стст. Беларускага Падзвіння, Падняпроўя і Панямоння (Гуревич, 1962, с. 109, рис. 98: 12; Заяц, 1996, с. 44; Вайцяховіч, 2005, с. 156).

Фрагмент бронзавага бранзалета з канцамі ў выглядзе стылізаванай выявы змяінай галавы добра вядомы ў балцкіх старажытнасцях (мал. 4:5). Другі бранзалет захаваўся напалову і мае завостраны край, арнамент імітуе пляценне, хаця стрыжань цэльналіты, захаванасць надзвычай добрая (мал. 4:6).

Індывідуальнай формай вылучаецца бронзавая падвеска ў выглядзе роўнаканцовага крыжа (мал. 4:4). Блізкія па форме падвескі выкарыстоўваліся насельніцтвам Аршанскага Падняпроўя ў X–XII стст. (Левко, 2004, рис. 25:4).

Дзве бронзавыя бразготкі неарнаментаваныя, з крыжападобнай прораззю (мал. 4:2–3). Такія бразготкі ў Полацку былі знойдзены ў пластах XII ст. Мініяцюрны гузік з бронзы, відаць, датуецца гэтым жа часам (мал. 4:1). Фрагмент арнаментаванай дзвюма гарызантальнымі лініямі бронзавай бразготкі з адной прораззю (мал. 3:8) падобны на вырабы, якія бытавалі ў Ноўгарадзе з сярэдзіны XI па сярэдзіну XIV ст. (Седова, 1981, рис. 8).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Бронзавае кольца (мал. 3:5) мае пяцігранны ў сячэнні стрыжань, краі разамкнутыя, дыяметр кольца 1,8 см. Прызначэнне не высветлена.

Пэўная частка рэчаў з каляровых металаў, верагодна, была зроблена на месцы, пра што сведчаць два фрагмента керамічных тыгляў для плаўкі металаў (мал. 13:4, 6), а таксама злітачак бронзы авальнай формы з дзвюма насечкамі, якія, верагодна, пазначалі вагу (мал. 4:16). Гэты выраб з'яўляўся сыравінным запасам ювеліра. Да рэшткаў ювелірнай вытворчасці можна аднесці таксама бронзавыя пласцінкі-абрэзкі і дрот (мал. 4:7, 8, 15), злітачак волава кулепадобнай формы (мал. 3:6), а таксама рэдкую знаходку – бронзавы ювелірны пінцэт (мал. 4:9). Аналагічны па форме пінцэт быў знойдзены С.В. Тарасавым на старажытным полацкім паселішчы і датуецца X–XI стст. (Тарасаў, 1998, мал. 48; НПГКМЗ, КВФ-3-1185/9).

З калекцыі бронзавых вырабаў прэзентатыўнасцю вылучаюцца два пярсцёнкі: рубчаты (мал. 3:4) і з авальным шчытком (мал. 3:3). Аналагічны рубчаты пярсцёнак быў знойдзены ў пахаванні могільніка Зябкі-Доўгае і датуецца XI–XII стст. (Дучыц, 2001, с. 113). У пахаванні знойдзены і маленькія гузікі-бразготкі, аналагічныя запалоцкім (мал. 4:1). Такія ж гузікі былі знойдзены падчас археалагічнага даследавання Браслава і датуюцца XI ст. (Семянчук, 1993, с. 96). Пярсцёнкі з авальным шчытком знойдзены ў Ноўгарадзе ў пластах канца XII – сярэдзіны XV ст. (Седова, 1981, с. 135). У Полацку пярсцёнак з выявай пяціканцовай зоркі на авальным шчытку быў знойдзены ў пласце XII ст. (Штыхов, 1975, с. 67).

Рэдкай знаходкай з'яўляецца свінцовая пломба з выявай святога (аверс) і расквітнеўшага крыжа (рэверс) (мал. 3:1). Пломба мае памеры 1,1×1,3 см. Знойдзена яна ў сярэднім стратыграфічным гарызонце.

Медная пласцінка прамавугольнай формы памерамі 1,9×4,7 см (мал. 3:11) мае адтуліны па краю (ад трох да чатырох на доўгай грані). Такія пласцінкі, відаць, выкарыстоўваліся як рамонтныя акоўкі на драўляны посуд. Яны прызначаліся для замацавання патрэсканай сценкі начыння дротам праз адтуліны ў пласцінцы. Для прыкладу варта прывесці пласціны, знойдзеныя на драўляным посудзе з кургана № 10 каля вёскі Пагошча (Браслаўскі раён Віцебскай вобл.), які датуецца канцом X – пачаткам XI ст. (Плавінскі, Плавінскі, 2007, с. 136, мал. 3). Фрагмент бронзавай накладкі быў знойдзены ў верхнім пласце зямлі, таму яго датаванне няпэўнае. Гэты выраб мог пачаткова выкарыстоўвацца для аздаблення скарбовых і іншых скрынь, пасля чаго з'яўляцца рамонтнай акоўкай драўлянага посуду.

Вялікую цікавасць прадстаўляюць артэфакты, якія з'яўляюцца пад'ёмным матэрыялам. Яны знойдзены краязнаўцам С.Л. Міхейкам і навуковым супрацоўнікам НПГКМЗ С.Я. Глазырыным у Запалоцці, у межах даследуемай тэрыторыі на беразе Дзвіны. Гэта серыя маленькіх бронзавых арнаментаваных ключыкаў ад куфэркаў (мал. 4:10–14), касцяны калок для струны (мал. 12:1), бронзавая завушніца са шкляной устаўкай, ужо згаданыя пярсцёнак з авальным шчытком (знойдзены на паверхні культурнага пласта каля дарогі Запалоцце–Чарнешчына за 150 м на поўнач ад раскопаў 1–2) і бронзавая сякерка-падвеска.

Бронзавыя ключыкі ад куфэркаў знойдзены ў колькасці 5 экзэмпляраў, з іх 3 – цэлыя, астатнія прадстаўлены фрагментарна. Ключыкі знойдзены на тэрыторыі Запалоцця, два з іх – на правым беразе Заходняй Дзвіны. Усе цэлыя ключыкі маюць багатую арнаментацыю і, нягледзячы на мініяцюрныя памеры, з'яўляюцца функцыянальнымі рэчамі.

Ключык № 1 мае двухбаковую выяву жывёлы і наступныя памеры: агульная даўжыня складае 3 см, дыяметр дзяржання 1 см, дыяметр утулкі 0,25 см (мал. 4:12). Ключык № 2 з аднабаковай выявай чатырохпялёсткавай кветкі на дзяржанні, яго даўжыня 2,6 см, дыяметр дзяржання 1 см і дыяметр утулкі 0,25 см (мал. 4:10).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ключык № 3 аздоблены аднабаковай выявай фантастычнай жывёлы, яго памеры і прапорцыі аналагічныя ключыку № 1 за адным выключэннем: ён мае больш шырокую «бародку» – 0,4 см, тады як у папярэдніх ключыкаў яна роўная 0,25 см (мал. 4:11). Фрагменты верхніх частак ключыкаў № 4 і № 5 (мал. 4:13–14) ніякіх істотных адрозненняў ад вышэй згаданых вырабаў не ўтрымліваюць, магчыма, яны з'яўляліся нарыхтоўкамі, аб чым сведчыць грубая апрацоўка паверхні (вынік няўдалай адліўкі ?) і адсутнасць дэкарацый.

Усе полацкія ключыкі не маюць стратыграфічнага датавання. Традыцыйна ў дэкоры ключыкаў выкарыстоўвалася міфалагічная тэматыка – гэтак званае геральдычнае супрацьстаянне. Вельмі падобная, а фактычна аналагічная выява фантастычнай жывёлы сустракаецца на замочных накладках з Ізборска і Пскова (Из археологической ..., 1994, ф. 11), якія датуюцца XIII ст.

Жалезныя вырабы прадстаўлены шырокім спектрам знаходак. Сярод іх вылучаюцца прадметы побыту, рамесныя інструменты, мілітарныя рэчы. Знойдзена два жалезных лучніка ў выглядзе выгнутага стрыжня з раз'ёмам пад лучыну (мал. 7:3–4).

Рамесныя інструменты і прылады працы прадстаўлены долатам (мал. 8:2), двума прабойнікамі (мал. 8:3, 4), дзвюма іголкамі для шыцця (мал. 8:5–6), кавалкам ляза касы-гарбушы (мал. 10:1), нажамі (мал. 5).

Долата мае выгляд жалезнага стрыжня прамавугольнага сячэння з завостранай рабочай плоскасцю (даўжыня 8,7 см, сячэнне стрыжня пасярэдзіне 0,5×0,4 см). Прабойнік трохвугольнай формы, сячэнне прамавугольнае, памерам каля тарца 1,4×0,3 см, вышыня стрыжня 6,5 см (мал. 8:3). Іголка мае даўжыню 6 см, круглае вушка на сплошчанай галоўцы, стрыжань круглы ў сячэнні (мал. 8:5). Другая іголка захавалася фрагментарна (мал. 8:6). Ад касы-гарбушы захаваўся абламаны край ляза. Яго шырыня 3 см, таўшчыня спінкі 0,3 см, край захаваўся на даўжыню 6,2 см (мал. 10:1).

Калекцыя нажоў налічвае 5 цэлых і 10 фрагментаваных вырабаў. Усе нажы чаранковыя, даўжынёй ад 6 да 9,5 см (цэлыя экзэмпляры). Нажы з Запалоцця не вылучаюцца вялікімі памерамі (максімальная даўжыня цэлых экзэмпляраў не перавышала 10,5 см).

Нажы, у якіх лязо пераходзіць у чаранок амаль без уступа, найбольш архаічныя (мал. 5:11, 14). Другая частка – гэта нажы з лязом, якое пашыраецца каля чаранка, а спінка мае ўступ (мал. 5:12–13). Дакладны аналаг нажу з Запалоцця (мал. 5:12) знойдзены каля вёскі Новыя Валосавічы Лепельскага раёна ў кургане канца X–XI стст. (Вайцяховіч, 2006, с. 94, мал. 7:3). Аналагічны па форме нож знойдзены і на тэрыторыі Беларускага Панямоння ў курганах X–XI стст. (Гуревич, 1962, рис. 90: 1). Розняць іх толькі памеры: даўжыня нажа з Запалоцця каля 10,5 см, нож з Панямоння каля 13,5 см. Нож, у якога чаранок знаходзіцца пад вуглом да ляза (мал. 5:13), быў знойдзены на гарадзішчы Новы Болецк у слаі X–XII стст. (Ляўко, Шадыра, 1993, с. 465).

Рыбалоўны кручок прызначаўся для лоўлі рыбы падчас вужэння (мал. 9:6). Кручок не мае бародкі, яго вышыня складае 3,9 см, даўжыня цаўя 2 см. Аналагічныя вырабы датуюцца XI–XIV стст., аднак іх максімальнае распаўсюджванне прыходзіцца на канец XII – пачатак XIII ст. (Ляшкевич, 2004, рис. 1:6–9).

Цвікі з Запалоцця маюць квадратны ў сячэнні стрыжань з плоскімі шляпкамі прамавугольнай ці няправільнай формы. Даўжыня цвікоў ад 2,8 да 7 см (мал. 6:1–9). Некаторыя рэдкія формы цвікоў маюць трохвугольную ў разрэзе шляпку ці загнуты ў выглядзе літары «Г» стрыжань (мал. 6:8, 9).

У сярэднім стратыграфічным гарызонце знойдзена жалезная дужка ад невялікага начыння (мал. 11:5), кручок для адзення (мал. 11:4), жалезны пярсцёнак

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дыяметрам 2 см з разамкнёнымі канцамі (мал. 9:1), паясная спражка авальнай формы (мал. 9:5), рукаяць ключа (мал. 7:1). Аналагічныя жалезныя пярсцёнкі былі знойдзены падчас археалагічнага даследавання гарадзішча каля вёскі Гарадзішча Мінскага раёна, верхні пласт якога датуецца IX – першай паловай XI ст. (Штыхаў, 1993, с. 157).

Скабяныя вырабы прадстаўлены фрагментарна (мал. 8:7, 9; 10:4–6; 11:2). Захаваўся прабой вышынёй 7 см з прамавугольным у сячэнні стрыжнем памерам каля 0,5×0,3 см (мал. 8:1). Прызначэнне дзвюх металічных завесак (?) застаецца не высветленым (мал. 8:8; 10:2).

Вельмі рэдкай з'яўляецца знаходка пласцінкі даспеха (мал. 7:6). Па вусным вызначэнні М.А. Плавінскага, аналагічныя пласцінкі датуюцца дастаткова шырока ў межах XI–XIV стст. Пласцінка прамавугольнай формы, мае памеры 3×7,1 см. Таўшчыня каля 1 мм. Фрагмент кальчугі складаецца з 10 кольцаў дыяметрам 1 см (мал. 7:5). Адзначым знаходку двух лёзаў сякер (мал. 2:6; 11:3).

Пірамідальны наканечнік стралы (мал. 7:7) мае даўжыню 6,5 см, пяро рамбічнае ў сячэнні шырынёй 0,8 см і вышынёй 4,2 см. Паводле А.Ф. Мядзведзева, стрэлы падобнага тыпу былі ва ўжытку толькі ў XII ст. (Медведев, 1966, с. 85, табл. 21:40).

Ключ ад нутранога замка (мал. 7:2), паводле наўгародскай класіфікацыі Б.А. Колчына, бытаваў з XII ст. па сярэдзіну XIV ст. (Колчин, 1982, с. 162). Падобны па форме ключ быў знойдзены ў Полацку ў пласце XIII ст. (Штыхов, 1975, рис. 31:17).

Асобнай групай прадстаўлены вырабы з жалеза, прызначэнне якіх не высветлена (мал. 9:2, 4, 7; 11:1). Гэтыя вырабы маглі з'яўляцца часткамі складовых прылад працы. Адкрытым застаецца пытанне пра прызначэнне жалезнай абойміцы (мал. 10:3) і паловы жалезнага грузіка (мал. 10:8).

Знойдзены далікатна апрацаваныя шкляная і сердалікавая пацеркі (мал. 13:2–3). Падобныя шарападобныя пацеркі з жаўтаватага празрыстага шкла (мал. 13:2) паходзяць з культурных напластаванняў XII–XIII стст. (Бубенько, 2004, с. 91; Загорульский, 1982, с. 234; Колчин, 1982, с. 169). Сердалікавыя біпірамідальныя пацеркі шырока вядомы ў курганных пахаваннях радзімічаў стадыі А, якая датуецца другой паловай X – пачаткам XI ст. (Богомольников, 2004, с. 68, рис. 9: 67). У Ноўгарадзе такія пацеркі датуюцца шырока ў межах XII–XIII стст. (Колчин, 1982, с. 170).

Праселкі з шыфернага сланца знойдзены ў колькасці 12 штук. Максімум іх бытавання ў Полацку і Віцебску вызначаецца XI–XIII стст. (Бубенько, 2004, с. 111; Штыхов, 1975, с. 97). Усе праселкі зроблены са сланца ружовага ці крэмавага колеру, маюць дыяметр у сярэднім 1,5–1,7 см, вышынёй да 1,5 см (мал. 12:7).

Касцяное дзяржанне на чаранковы нож знодзена ў сярэднім стратыграфічным гарызонце (мал. 12:4). Тут жа знойдзены асялок у выглядзе пласцінкі таўшчынёй 3 мм для заточкі іголак, зроблены з шыфернага сланца (мал. 12:5) і фрагмент трохвугольнага па форме крамянёвага выраба, даўжыня граняў якога складае 2,4 см, максімальная таўшчыня – 0,5 см (мал. 12:3). Асялок з дробназярністага шэрага граніту мае прамавугольную форму з закругленымі краямі, памеры выраба 2,5×3,7×1,8 см (мал. 12:2).

Касцяны калок для струны з'яўляецца пад'ёмным матэрыялам (мал. 12:1). Ён мае вышыню 3 см і прызначаўся для струннага музычнага інструмента.

Керамічныя вырабы прадстаўлены пераважна фрагментамі гаршкоў, зробленых на ручным ганчарным крузе. Ляпны посуд адсутнічаў. У сярэднім стратыграфічным пласце знойдзены адзін цэлы гаршчэчак (мал. 15:1) і адзін без венца (мал. 14:3). Абодва з'яўляюцца прысадзістымі па форме вырабамі, з дамешкамі жарствы ў керамічным цесце. Вышыня цэлага гаршка складае 9 см,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дыяметр венца – 7 см, донца – 6 см. На сценках захаваліся плямы абвары. Венца гаршка прамое (вышыня каля 2 см), крыху адхіленае вонкі, край венца завостраны з раўчуком пад накрыўку. Венца багата арнаментавана: па краю зроблены насечкі з нахілам у правы бок, ніжэй размешчаны хвалісты арнамент з нахілам у левы бок, ніжэй зноў рад насечак, але з нахілам у левы бок і ніжэй зноў паўтараецца хвалісты арнамент. Гаршчок мае вушкі-петлі для падвешвання на вяровачцы, петлі прымацаваны да плечука гаршка. Донца гаршка злёгку ўвагнутае і мае выразныя сляды спіральна-кальцавога фармавання.

Другі гаршчок мае дыяметр донца 5,2 см, захаваная вышыня 5,5 см, максімальнае пашырэнне тулава 8,3 см (мал. 14:3). Гаршчок пазбаўлены арнаментацыі, на ім адсутнічаюць плямы абвары.

Пераважная большасць гаршкоў з сярэдняга стратыграфічнага гарызонта маюць выразны S-падобны профіль венца, як правіла, з раўчуком пад накрыўку (мал. 16–17). Кераміка з ніжняга стратыграфічнага гарызонта (перадмацерыка і мацерыковых ям) аналагічная кераміцы сярэдняга гарызонта. Усе гаршкі зроблены на ручным ганчарным крузе, маюць дамешкі жарствы і пяску ў керамічным цесце, нярэдка цеста даволі грубае з-за прысутнасці вялікай колькасці буйной (1–3 мм) жарствы. Паверхня гаршкоў няроўная, гузаватая. Арнаментацыя на гаршках сустракаецца рэдка, пераважна гэта хваля па плечуку і па краю венца, чаргаванне хвалі з насечкамі і лінейным арнаментам, некалькі хваляў, зрэдку хвалі па ўнутранаму краю венца. Аднак звычайны арнамент – гэта рэдкія гарызантальныя лініі па вонкавым (зрэдку – унутраным) баку венца.

Донцы гаршкоў маюць борцік па краю, які выступае на 1–3 мм (мал. 16:9–10, 14; 19:6) . Некаторыя донцы маюць клеймы ў выглядзе круга (мал. 14:4), крыжа ў крузе (мал. 14:2), паралельных ліній (мал. 14:8), насечак з унутранага боку (мал. 14:7).

З посуду, акрамя гаршкоў, знойдзены кавалак донца друшляга (мал. 13:5), верхняя частка накрыўкі. З культурнага пласта Запалоцця паходзіць таксама кавалак керамічнага грузіка ад сеці. Грузік мае дзежкападобную форму, даўжынёй 3,2 см, дыяметрам 2,8 см (дыяметр адтуліны 1,4 см (мал. 13:7)). Выраб мае арнамент у выглядзе трох насечак.

Амфары знойдзены ў колькасці 9 фрагментаў сценак, з іх 1 – фрагмент плечука з ручкай (мал. 15:2). Амфары – гэта надзейнае сведчанне паўднёвага імпарту. Сценкі амфар аздоблены лінейным арнаментам у выглядзе дробных гарызантальных палосак. Амфары ў вялікай колькасці (больш за 130 рэшткаў) былі знойдзены падчас раскопак Верхняга замка і датуюцца XI – 20–30-мі гг. XIII стст. (Штыхов, 1975, с. 87), але максімум іх бытавання прыходзіцца на XII ст. (Тарасаў, 1998, мал. 44).

Агульнымі ў характарыстыцы керамікі з раскопа 1 з'яўляюцца наступныя прыкметы. Кераміка з грубымі дамешкамі жарствы, паверхня няроўная, з палоскамі і ямкамі, утворанымі пры фармаванні на ганчарным крузе. Арнамент на начынні лінейны, хвалісты ці з насечкамі, нярэдка спалучае некалькі дэкаратыўных элементаў. Арнамент наносіўся па верхняй частцы тулава, вонку па плечыку і венцу, зрэдку – з унутранага края венца. Большая частка керамікі з раскопу 1 і шурфоў у Запалоцці па профілю венца падобная на кераміку тыпу IV з полацкага Верхняга замка (Штыхов, 1975, с. 81) ці тыпу Д2 і Д5 з Мінскага замчышча, якая, па назіранні Э.М. Загарульскага, «очень ровно распространена в течение всего периода (XI–XIII стст. – Д.Д.) и не может служить хронологическим целям внутри этого диапазона времени» (Загорульский, 1982, с. 241).

Статус сярэднявечнага насельніцтва даследаванай часткі Запалоцкага пасада вызначаюць свінцовая таварная пломба, керамічныя амфары, тыглі для плаўкі каляровых металаў, ювелірныя і іншыя інструменты. Паводле наяўнага рэчавага матэрыялу можна зрабіць выснову, што на пасадзе сяліліся рамеснікі і гандляры.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Час засялення заходняй часткі Запалоцкага пасада можна надзейна датаваць у межах XI ст. З пэўнай доляй верагоднасці можна вызначыць пачатак засялення дадзенай тэрыторыі на мяжы X–XI стст. Верхнюю храналагічную мяжу сярэдняга стратыграфічнага гарызонта можна акрэсліць мяжой XII–XIII стст. Па-першае, сярод знаходак адсутнічаюць шкляныя бранзалеты (знойдзены толькі 1 фрагмент у пераадкладзеным пласце шурфа 4), шырокае бытаванне якіх у Полацку прыпадае на 1220-я – 1250-я гг. (Штыхов, 1975, с. 95). Па другое, сярод фрагментаў керамікі раскопа 1 не вылучаны пераходныя формы да познесярэднявечных тыпаў другой паловы XIII–XIV стст. Па-трэцяе, значная частка рэчаў мае верхнюю храналагічную мяжу існавання XII ст. Нарэшце, сярэдні стратыграфічны гарызонт адносна невялікай магутнасці і аднародны па структуры, тады як на Вялікім пасадзе і Верхнім замку напластаванні XIII ст. адны з самых вялікіх і стратыграфічна стракатых.

Археалагічных сведчанняў пра засяленне заходняй часткі Запалоцкага пасада ў XIV–XV стст. няма. Комплекс рэчаў верхняга стратыграфічнага гарызонта нешматлікі і ўкладаецца ў дыяпазон XVI–XIX стст. Выразных слядоў пабудоў XVI–XIX стст. у заходняй частцы Запалоцкага пасада не выяўлена. Верагодна, у гэты час заходняя частка Запалоцкага пасада не была заселена. Яна магла выкарыстоўвацца пад гароды ці выпасы хатняй жывёлы, пра магчымасць рэдкай фальваркавай забудовы сведчаць нешматлікія фрагменты пячной кафлі.

Літаратура

1. **Бохан, Ю.М.** Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. Мн., 2002.

2. **Богомольников, В.В.** Радимичи (по материалам курганов X–XII вв.). Гомель, 2004.

3. **Бубенько, Т.С.** Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.). Витебск, 2004.

4. **Вайцяховіч, А.** Тры ўзроўні інгумацыі ў курганах Полацкай зямлі (на прыкладзе курганнага могільніка Звязда) // ГАЗ. № 20. 2005. С. 150–162.

5. **Вайцяховіч, А.В.** Курганны могільнік каля вёскі Новыя Валосавічы Лепельскага раёна // МАБ. № 11. 2006. С. 94–103.

6. **Голубева, Л.А.** Назначение железных игл с кольцами // СА. № 4. 1971. С. 114–125.

7. **Гуревич, Ф.Д.** Древности Белорусского Понёманья. М., 1962.

8. **Даркевич, В.П.** Топор как символ Перуна в древнерусском язычестве // СА. № 4. 1961. С. 90–101.

9. **Дук, Д.** Палата, Запалоцце, Полацк – пачатак сярэдневяковага горада // БГЧ. № 3. 2007. С. 33–36.

10. **Дук, Д.У.** Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 г. // Археалагічны зборнік. Вып. 1. Мн., 2006. С. 52–57.

11. **Дучыц, Л.** Курганны могільнік Зябкі-Доўгае // ГАЗ. № 16. 2001. С. 111–114.

12. **Загорульский, Э.М.** Возникновение Минска. Мн., 1982.

13. **Заяц, Ю.А.** Анусинские курганы // ГАЗ. 1996. С. 43–57.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

14. **Заяц, Ю.А.** Заславль в эпоху феодализма. Мн, 1995.

15. **Звяруга, Я.Г.** Рэчавы інвентар // Археалогія Беларусі. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). Мн., 2000. С. 370–423.

16. Из археологической коллекции псковского музея. М., 1994.

17. **Колчин, Б.А.** Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода. М., 1982. С. 156–177.

18. **Левко, О.Н.** Средневековые административно-территориальные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие. Мн., 2004.

19. **Ляўко, В.М., Шадыра, В.І.** Новы Болецк // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 464–466.

20. **Ляшкевич, Э.** Рыболовство в средневековом Гродно (по материалам раскопок Старого замка) // ГАЗ. 2004. № 19. С. 191–203.

21. **Макушников, О.** Между Гнездовом и Киевом: Моховский археологический комплекс X–XI вв. на юго-востоке Беларуси // ГАЗ. 2006. № 22. С. 130–138.

22. **Медведев, А.Ф.** Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) XIII–XIV вв. / САИ. Вып. Е1-36. М., 1966.

23. **Плавінскі, М., Плавінскі, А.** Аб адной катэгорыі пахавальнага посуду ў курганах канца I – пачатку II тыс.н. э. на захадзе Полацкай зямлі // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. I. 2007. С. 135–145.

24. **Покровская, Л.В.** Новгородские одежные булавки (X–XIII вв.) // Историческая археология: традиции и перспективы. М., 1998. С. 175–181.

25. **Седова, М.В.** Ювелирные изделия древнего Новгорода (X–XV вв.). М., 1981.

26. **Семянчук, Г.М.** Браслаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 95–96.

27. **Семянчук, Г.М.** Раннесярэднявечны грунтовы могільнік Дрысвяты-Пашавічы // ГАЗ. 2002. № 17. С. 191–195.

28. **Тарасаў, С.В.** Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998.

29. **Штыхов, Г.В.** Древний Полоцк IX–XIII стст. Мн., 1975.

30. **Штыхаў, Г.В.** Гарадзішча // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 157–159.

31. **Штыхаў, Г.В.** Полацкія крывічы // Археалогія Беларусі. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). Мн., 2000. С. 14–32.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова